Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

адчынім сэмафоры транспорту

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

і Жлобінскі РК ЛКСМБ 20 лютага склікаюць **нараду комсамольцаў машыністых,** **іх памочнікаў і сьлесароў сумесна з спэцыялістымі і профэсыйна-гаспадарчымі організацыямі**

по пытаньню конкрэтных спраў комсамолу на транспорце.

N 40

АСУНЕМ ТРАНСПОРТ УПЕРАД

сваёй адозьве ЦК УсеКП(б) і СНК арнулі перад партыйнымі, профэ-ными, гаспадарч мі і комсамольскі-рганізацыямі баявую програму ра для ліквідацыі прарываў, якія ма-а на транспорце.

Задача ў тым, каб узяцца нарэшце альшавіцку за справу транспорту сунуць яго ўперад" (Сталін).

ала крычаць аб недахопах і бяс-ствах, якія твораца на транспор-Трэба ўсямерна дапамагчы транс-у, трэба перавесьці рашэньні пар ных і савецкіх організацый на крэтную мову баявых спраў.

узлавыя задачы комсамолу ў ба-ьбе за транспорт, гэта—барацьба здаровы паравоз і за максымальную номію апалу. Для ажыцьцяўленьня іх задач трэба перанесьці вопыт ацьбы комсамолу за прамфінплян радпрыемстваў на транспорт.

эзкі пералом у рабоце транспорту а быць забясьпечан пры ўмове, комсамольскае кіраўніцтва пера-уецца на аснове гаспадарчай рэор-зацыі транспорту. Яно павінна рэ-рганізавацца на „аснове опэрацый-ьні, якая злучае вялікі ідэйна-палі-ны размах з уменьнем організоў-ь масы моладзі на выкананьне па-бных конкрэтных задач" (рашэньні езду).

зяцца па-бальшавіцку за справу спорту, гэта значыць—вывучыць эцыяльных гуртках і ператварыць ыцьцё японскую сыстэму хуткага ньня паравозаў, у аснове якое ыць дакладнае плянаваньне, у су-з гэтым організацыя плянава-опэ-йных груп—зьяўляецца галоўным зам у барацьбе за здаровы пара-

Іто-ж для гэтага трэба?

— Організаваць скразны кон-, пачынаючы ад рамонту парава-і канчаю ы машыністым і яго па-нікам. (Гэта магчыма ажыц цявіць ьвязку з пераходам транспорту на гадарчую язду.)

рганізаваць скразныя брыгады па онту з падразьдзяленьнем на паасоб-галіны, каб гарантаваць хутчэйшы пшы рамонт паравозаў.

зяць шэфства над паравозамі, ут-ыць спэцыяльн я комсамольскія ты, якія-б недапускалі лішняга пе-огу, вылучыць рэзэрвыя цягніко-брыгады, організаваць сустрэч-пляны экономіі апалу. Акрамя га, неабходна ўжыць рад мера-иемстваў, каб як найхутчэй пра-ваць сыравіну і паўфаб ыкаты на ы соцыялістычныя прадпрыемствы, н.—уключыць транспорт у скраз-соцыялістычны конвэер.

опыт работы скразных брыгад па онту паравозаў на Жлобінскім вуз-паказвае, што, пры мобілізацыі ргіі комсамольскай організацыі, рагам конкрэтных мерапрыемстваў, ую магчымасьць забясьпечыць мож-

мэтай абгаварыць і ажыцьцёвіць эйадзначаныя мерапрыемствы, акцыя „Чырвонай Зьмены" і РК СМБ 20-га лютага склікаюць спэ-льную нараду цягніковых брыгад лесароў, сумесна з спэцыялістымі аспадарча-профэсыйнымі організа-мі.

крамя гэтага, мы прапануем у жэйшы час склікаць пры ЦК ЛКСМБ цыяльную нараду, каб абгаварыць аньні аб формах і мэтадах пера-довы комсамольскай работы на чы-ны.

Ліквідацыя вузкіх месц на тран-рце павінна стаць зараз галоўней-й задачай для комсамоліі чыгунач-с організацый і ўсяго ЛКСМБ.

Ударная, комсамольская

Нязвычайна блішчэлі шэрыя вочы **Альфрэда Крума**—кіраўніка брыгады імя X-га зьезду ЛКСМБ (Жлобінскае дэпо), калі ён расказваў нам аб рабоце брыгады па рамонту паравозаў.

Організаваная ў другой палове сьнежня з 11 сьлесароў і 2 чорнарабочых—былых фабзайцаў, яна з першых-жа дзён свайго існаваньня паказала ўдарныя тэмпы работы і дасканалую якасьць.

У прарыве народжаная

У сьнежні Жлобінскі вузел перажыў буйнейшы прарыў. Для ліквідацыі прарыву ячэйка ЛКСМБ стварыла скразную брыгаду па рамонту паравозаў, замест брыгад па паасобных працэсах рамонту. Разьбіўшы скразную брыгаду на групы (дышлавікоў, залатнікоў, арматуршчыкаў, тормазьнікаў і экіпажную), каб кожная ведала сваю галіну работы—, брыгада прыступіла да працы.

За ўдарную паказальную работу, за добрую якасьць выпусканых паравозаў была прэміявана. З таго часу яна заваявала шырокую папулярнасьць на ўсім вузьле.

Так брыгада атрымала ў рамонт канчаткова разьбіты паравоз. З вялікімі цяжкасьцямі направіла старыя часткі і выпусьціла ў эксплёатацыю зусім здаровы паравоз—без асаблівых затрат.

За час свайго існаваньня брыгада выпусьціла звыш 30 паравозаў. Не адзін з іх не вярнуўся ў паўторны рамонт. Гэта—найбольш яркі прыклад пасьпяховай барацьбы за здаровы паравоз.

Перамагчы цяжкасьці

Гэтымі днямі ў Жлобіне адбываўся VI-ы раённы зьезд саветаў. Рабочыя дэпо ўзяліся ў падарунак зьезду адрамантаваць 2 паравозы, а брыгада самастойна адрамантавала 3-ці.

Паравоз № 5826 сэрыі „ОВ" быў адрамантаваны з абточкай за 3 з паловай дні, тады як на рамонт гэтага паравозу трэ' было затраціць каля 2-х тыдняў. Пры выпуску паравозаў прысутнічала ўся адміністрацыя. Майстар з пляцоўкі паравоза прывітаў зьезд. Машына была пушчана ў эксплёатацыю і адразу зламаўся шток поршня.

Дрэнны рамонт? Расхлябанасьць?

Не! У поршні знайшлі гайку у $1^1/_8$ дзюйма. Тут бязумоўна шкодніцтва.

Ня рэдкі выпадкі зьяўляцца частак з адрамантаваных брыгадай паравозаў. Рукі рвачоў, лодыраў і шкоднікаў імкнуцца сарваць работу комсамольцаў-энтузіястых.

Аднак, усё гэта не перашкаджае брыгадзе карыстацца вялікім аўторытэтам у дэпо і лічыцца сапраўды бальшавіцкімі ліквідатарамі прарываў у рамонце паравозаў.

Начальнік цягі тав. Ісаеў, і майстар дэпо тав. Малакаедаў, з надзвычайнай цяплынёю адзываюцца аб брыгадзе:

— Калі-б у нас штук 8 такіх брыгад,—кажа тав. Ісаеў, разводзячы рукамі,—дык аб прарывах мы-б і ня ведалі. Гэта лепшыя рабочыя дэпо, якім можна даць найбольш сур'ёзную працу.

Тав. Ісаеў ганарыцца брыгадай. І не дарма, бо ў брыгадзе ёсьць яшчэ выдатная рыса: яна зьяўляецца прадметам глыбокай увагі комсамольскай організацыі.

Ячэйка, станцыйны камітэт, райком ЛКСМБ сумесна з брыгадай радуюцца яе дасягненьням, дапамагаюць ёй ліквідаваць недахопы. Весь адзін з сакрэтаў посьпехаў брыгады.

Другая бальшавіцкая

Зараз у дэпо організавана другая скразная брыгада комсамольцаў, імя 6-га райзьезду саветаў, у адказ на адозву ЦК УсеКП(б) і СНК. Першыя дні яе работы ўжо падаюць надзеі на тое, што і яна зможа зьявіцца ўзорнай па сваей працы ў дэпо.

Усе комсамольскія організацыі па вопыту жлобінцаў, павінны організаваць скразныя брыгады комсамольцаў па рамонту паравозаў.

К.

Стварыць транспортны сэктар пры ЦК ЛКСМБ

(У парадку абгаварэньня)

У сувязі з пастановай партыйных і савецкіх організацый аб рэорганізацыі чыгуначнага транспорту, ставіцца ва ўпор пытаньне: Як рэорганізаваць кіраўніцтва комсамольскімі організацыямі такім чынам, каб забясьпечыць максымальны ўдзел іх у гаспадарча-політычным жыцьці транспорту, і ў першую чаргу—у ліквідацыі прарываў, якія ёсьць на транспорце?

Да гэтага часу кіраўніцтва комсамольскімі організацыямі на чыгунцы ажыцьцяўлялася праз так званыя „галоўныя" і мясцовыя райкомы ЛКСМБ. Такі мэтод кіраўніцтва сябе не апраўдаў, таму што галоўнымі райкомамі зьяўляліся камітэты, якія па сутнасьці ўдзелялі больш увагі мясцовым ячэйкам (асабліва вясковым) чым пытаньням работы транспорту на лініі. Дзякуючы гэтаму актыўны ўдзел комсамольскай організацыі ў рабоце чыгункі, ліквідацыі прарыву яўна недастатковы.

Для хутчэйшай рэалізацыі адозвы СНК і ЦК УсеКП(б) неабходна зараз-жа перабудаваць усю працу ЛКСМБ на чыгунцы ў адпаведнасьці з рэорганізацыяй кіраўніцтва ёю.


Неабходна комсамольскае кіраўніцтва організаваць такім чынам, каб яно аўладала максымальнай опэрацыйнасьцю. Дзеля гэтага, па нашай думцы, трэба ўвесьці спэцыяльную адзінку—сэкратара—організатара ЛКСМ пры эксплёатацыйным чыгуначным раёне, які павінен займацца кіраўніцтвам комсамольскімі ячэйкамі, расстаноўкай сіл па ўсім эксплёатацыйным раёне і знаходзіцца пад кіраўніцтвам станцыйнага і раённага камітэтаў комсамолу.

Мы лічым неабходным стварыць пры ЦК ЛКСМБ спэцыяльны транспортны сэктар, які-б ажыцьцяўляў кіраўніцтва работай комсамолу на чыгунцы.

Адначасова мы лічым неабходным выканаць дырэктывы, даныя ЦК чыгуначнікаў яшчэ ў мінулым годзе, аб спэцыяльных адзінках прадстаўнікоў комсамолу ў райпрофсожы і аб палепшаньні і пасіленьні кіраўніцтва імі з боку прадстаўніка ЦК ЛКСМБ у бельбюро ЦК чыгуначнікаў.

Мы высоўваем сваю думку на абгаварэньне комсамоліі чыгункі і лічым, што ЦК комсамолу павінен у бліжэйшыя дні заняцца гэтым пытаньнем.

ШАУЦОЎ.



„Мы патрабуем ад комсамольскіх організацый сапраўды бальшавіцкай працы для таго, каб транспорт запрацаваў па-новаму і задаволіў патрэбы народнай гаспадаркі" (Кагановіч)

№ 40 (1309) | ЧАЦЬВЕР, 19-га лютага 1931 г.

ЗЬМЯНІЦЬ ОПОРТУНІСТЫЧНАЕ КІРАУНІЦТВА

Комсамолія Чашнік павінна па-бальшавіцку ліквідаваць прарыў

Райком не забясьпечыў правядзеньне лініі партыі

На X зьезьдзе комсамолу Беларусі. Спатканы абурэньнем усяго зьезду, стаўшы ў позу сыгналізатара, былы сэкратар Чашніцкага РК ЛКСМБ Шурыц заявіў: „комсамол вёскі ня можа спраўляцца з тымі задачамі, якія высунуты партыяй на вёсцы".

Выказаўшы сваё нявер'е ў сілы і здольнасьці ленінскага камсамолу ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі, стаяўшы на чале райкому Шурыц не забясьпечыў патрэбнага кіраўніцтва з боку райкому шэрагам важнейшых вучасткаў практычнай дзейнасьці раённай організацыі. І вось, здаровая ў сваёй масе Чашніцкая організацыя комсамолу на шэрагу важнейшых вучасткаў мае буйнейшыя політычныя прарывы.

Як паказваюць зьмешчаныя сёньня матар'ялы, комсамольскі колектыў фабрыкі ня быў мобілізаваны на барацьбу з прарывамі. Значная частка вясковых ячэек не забясьпечыла патрэбнай работы па колгаснаму прыліву, нават і ў падрыхтоўцы да вясновага севу ў шэрагу ячэек выпадае барацьба за колгасны прыліў. Работа з беднатой і батрацтвам, як правіла, у ячэйках настаўлена кепска. Шэраг ячэек зусім ніякай работы не праводзяць, ячэйкі зусім слаба ўдзельнічаюць у нацыянальна-культурным будаўніцтве, вайскова-фізкультурнай рабоце.

Райком не мобілізаваў організацыю на барацьбу з права-опортуністычнай практыкай, якая мае месца ў шэрагу ячэек.

Ужо той факт, што на працягу чатырох месяцаў райком не знайшоў патрэбным заслухаць пытаньне аб выкананані прамфінпляну на фабрыцы, што паставіўшы справаздачы чатырох колгасных ячэек, ня даў ім практычных указаньняў, па ўдзелу організацыі ў колгасным будаўніцтве, гаворыць за тое, што бюро райкому на чале з Шурыцам ня толькі не забясьпечыла кіраўніцтва гаспадарчым вучасткам, але па сутнасьці абмяжоўвала ўдзел комсамольскай організацыі ў гаспадарчым будаўніцтве.

Гэта пацьвярджаецца яшчэ і тым, што пасьля праверкі становішча організацыі прадстаўнікамі ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмены" і выяўленьня буйнейшых прарываў бюро райкому, замест бальшавіцкага прызнаньня сваіх памылак у кіраўніцтве імкнулася прыкрыць іх заяўкамі аб „правільнасьці ў асноўным лініі райкому". І такое пакрываньне, змазваньне сваіх памылак павяло бюро райкому па шляху прыкрыцьця па сутнасьці права-опортуністычнага выступленьня Шурыца на X-ым зьезьдзе ЛКСМБ, аб гэтым поўнасьцю пацьвярджае пастанова бюро райкому, ў якой, у процівагу вывадам камісіі запісана: „ня гледзячы на выступленьне Шурыца на X зьезьдзе ЛКСМБ, бюро райкому праводзіла правільную лінію партыі ў асноўным".

Характэрна адзначыць, што такога-ж зьместу пастанова была прынята і раней, дзе запісана, што „выступленьне сэкратара РК КСМ тав. Шурыца нічога агульнага з сапраўдным становішчам справы ў ў раённай комсамольскай організацыі ня мае. Між тым праверка організацыі выкрыла, што на шэрагу важнейшых вучасткаў райком не забясьпечыў мобілізацыі комсамольскіх мас і што опортуністычныя пастроі Шурыца знайшлі свой адбітак у кіраўніцтве бюро райкому.

І толькі пасьля таго, як райком партыі выступіў супроць рашэньня райкому ЛКСМБ ацаніўшы яго опортуністычным бюро райкому КСМ прымушана было перагледзець сваё рашэньне і прызнаць памылкі. І пасьля таго, усё-ж на агульным раённым комсамольскім сходзе частка членаў бюро РК не падвергла належнай крытыцы свае політычныя памылкі.

Выступленьне былога сэкратара райкому, Шурыца, які і на сходзе паспрабаваў па сутнасьці змазаць політычныя прарывы ў кіраўніцтве райкому, не атрымала належнага асуджэньня з боку часткі выступаючых членаў бюро райкому ЛКСМБ.

Меўшае месца на гэтым сходзе права - опортуністычная вылазка члена партыі Багданава, які выступіў у абарону права опортуністычнага выступленьня Шурыца на X-ым зьезьдзе ЛКСМБ з боку выступіўшых пасьля вылазкі членаў бюро РК Ідэльштэйна, Барэйкі не атрымала адпору і яны нават не заявілі сходу аб сваім адмежаваньні ад гэтай вылазкі.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што бюро райкому ня стала на шлях бальшавіцкага прызнаньня і выпраўленьня сваіх памылак, і ня здольна стаяць на чале ў асноўным здаровай Чашніцкай організацыі комсамолу.

Цэнтральнае зьвяно ня ў цэнтры работы

Чашніцкая комсамольская організацыя зрабіла шмат у колгасным будаўніцтве. У колгасах і вёсках раёну раскажуць вам аб гэтай рабоце. Шэраг комсамольскіх ячэек былі ініцыятарамі організацыі колгасаў.

Зараз колгасамі ахоплена 30 проц. зямельнай плошчы і 22-23 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну. Амаль усе гэтыя колгасы організаваны ў час вясновага севу 1930 году. Яны вытрымалі барацьбу з кулацтвам і перамаглі меўшыя месца ў раёне скажэньні партыйнай лініі колгаснага будаўніцтва.

А як-жа зараз справа з прылівам у колгасы?

Паявіны адзначыць, што прыліў у раёне зусім слабы. Ён выміраецца лічбаю 208 гаспадарак, якія ўступілі ў колгасы да 1 лютага 1931 году, прычым большасьць іх—увосень пасьля кастрычніка 1930 году.

У большасьці колгасаў яшчэ не разьмеркаваны ўраджай. Колгасы не рабілі справаздачы перад аднаасобнікамі, якія мала ведаюць аб жыцьці колгасаў. Усё гэта—плод грубых скажэньняў дырэктыў партыі.

Сельсаветы, партыйныя і комсамольскія ячэйкі раёну не вядуць патрэбнай работы па колгаснаму прыліву. Узяць хаця-б для прыкладу Іванскі сельсавет. Ён, можна сказаць, „самы прыкладны" па скажэньню партыйнай лініі. Там месціцца партыйная ячэйка і 4 комсамольскія. Комуна і 6 колгасаў, якія яднаюць 194 гаспадаркі. А прыліву на сёньня—толькі 16 гаспадарак. Пры большасьці колгасаў маюцца групы беднаты. Партыячэйка не праводзіла сыстэматычнай работы сярод беднаты і батрацтва, не организоўвае яго на правядзеньне мерапрыемстваў партыі і савецкай улады, падмяняе гэтую работу адміністраваньнем, допускаючы рад „левых" загібаў. Па плану лес з да 53 гаспадарак планавана на розных загатоўках толькі 19 даведзены правільна, а з рэшты развёрстку былі зьняты з прычыны перагібаў. У гэтым сельсавеце зразумела давядзеньне плянаў да кулацкіх і заможных гаспадарак як мэтад загатовак, і даводзілі іх да серадняцкіх і бядняцкіх.

Палітычная блізарукасьць

Сельсавецкі і сакратар партячэйкі тав. Старыковіч, гавораць, што кулакоў у с-с. няма. Але факты кажуць аб засмечаньні колгасаў кулацкімі элементамі. Напрыклад, у колгасе „Кокцяўічы" знаходзіўся Яськевіч, які да ўступленьня ў колгас меў 20 дзесяцін зямлі, пару коней, дзьве каровы, цёлку, два... сьвіньні. Пры ўступленьні добрага каня прадаў, а горшага прывёў у колгас. Па вестках сельсавету гэты Яськевіч лічыцца беднаком і вызвалены ад сельгасподатку.

Колгасы засмечаны і па іншых сельсаветах. У колгасе „Горы", Цяпінскага сельсавету знаходзіцца Жылінскі Фядот. Да ўступленьня ў колгас ён жыў на фальварку, меў 20 дзесяцін зямлі, 4 каровы, наймаў батракоў. Пры ўступленьні ў колгас тры каровы здаў.

Кулацкія і варожыя элементы далёка ня выяўлены. У раёне лічыцца зараз усяго 20 кулакоў, а месяц таму назад лічылася толькі 10. Хаця ў пастановах райкому партыі, райколгасасаюзу і іншых організацый і зазначана аб вялікай засмечанасьці колгасаў, слабасьці работы па прыліву ў колгасы, але з прылівам усё-ж справа стаіць кепска.

Правая практыка—галоўная перашкода ў прыліве

Галоўная перашкода ў організацыі прыліву—гэта права-опортуністычная практыка ў рабоце організацый раёну, якая знайшла сваё месца ў радзе зьвеньняў комсамольскіх організацый. Напрыклад, Капцэвіцкая ячэйка комсамолу ў свой час прымала ўдзел у організацыі колгасу, а зараз нічога не робіць для прыліву, не вядзе сыстэматычнай работы сярод беднаты і батрацтва. У намечаных мерапрыемствах па падрыхтоўцы да вясновага севу ячэйка нават і не паставіла перад сабой задачу організаваць колгасны прыліў.

Комсамольская ячэйка колгасу Сталіна ў распрацаваных мерапрыемствах да вясновага севу ўпусьціла прыліў, ня гледзячы на тое, што ў колгас за ўвесь час увайшло толькі 4 гаспадаркі. Па Іванскім сельсавеце за ўвесь час уступіла ў колгасы толькі 16 гаспадарак.

Аб слабасьці п р ы л і в у гавораць лічбы з іншых сельсаветаў. Па Альшанскім сельсавеце ўступіла ў колгас усяго 10 гаспадарак, Пачаевіцкім—18 гаспадарак, Дварэцкім—21 гаспадарка і толькі па Астроўскім сельсавеце—59 гаспадарак і па Лазукоўскім сельсавеце—53. Значная частка комсамольскіх ячэек на сваіх ласеджаньнях нават і не абгаварвалі пытаньня аб колгасным прыліве, а Капцэвіцкая ячэйка 26-XII-30 г. абмежавалася пастановай: „сачыць за вылазкамі ворага і паведамляць бюро ячэйкі".

Праводзімыя кампаніі (уборачная, загатовачная, перавыбараў саветаў) ня ўвязваюцца з колгасным прылівам.

Райком не забясьпечыў кіраўніцтва

Хаця комсамольцы ў сваёй большасьці і служаць прыкладам у рабоце колгасу, але далей гэтага справа не пашла. Соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў колгасах не разгорнута. Комсамольскія ячэйкі на гэтую справу не мобілізаваны.

узорам безадказнасьці і здачы клясавых позыцый можа служыць комсамольская ячэйка савгасу Пачаевічы. Ячэйка не праводзіла ніякай работы. Комсамольцы займаліся п'янкай, рэлігійнымі абрадамі, ячэйка згубіла ўсякі аўторытэт. Беспартыйная моладзь колгасу гаворыць: „піць і дзяцей хрысьціць мы можам і без комсамолу".

А дзе-ж быў райком?

Райком не мобілізаваў увагу організацыі на барацьбу з права-опортуністычнай практыкай у шэрагу зьвеньняў організацыі. Кіраўніцтва ячэйкамі па колгаснаму прыліву райкомам не забясьпечана. Заслухаўшы справаздачу 4 колгасных ячэек, райком абмежаваўся пастановай прызнаць работу слабай і ня даў ніякіх практычных указаньняў.

ЖАРЫН.

Колектыў не мобіліза[...] на ліквідацыю прар[...]

Папяровая фабрыка „Чы[...] Зорка", Чашніцкага раёну, ш[...] на не дадае краіне 11 тон п[...] Прамфінплян ударнага кв[...] выкананы на 84,8 проц. П[...] тальнаму будаўніцтву—на 7[...] Замест зьніжэньня на 8,4 [...] сабекошт павысіўся на 3,5[...] За студзень месяц 1931 году [...] фінплян выкананы толькі на 7[...]

На фабрыцы—прарыў за п[...] вам. Ня гледзячы на гэта [...] комсамольскага колектыву за [...] нія 4—5 месяцаў амаль не [...] лася пытаньнямі ліквідацыі [...] рываў. На партыйным сход[...] абгаварвалася пытаньне аб [...] фінпляне, прысутнічала 15—20 комсамольцаў.

Соц. спаборніцтва і ўдар[...] на фабрыцы разьвіты слаба. [...] фармальна 93 проц. комсам[...] і ахоплены ўдарнымі бры[...] але-ж рад брыгад ня вык[...] ўзятых на сябе абавяза[...] стваў. Толькі некаторыя бр[...] аформлены соц. умовамі, а ў [...] няма лічбовых паказчыкаў [...] мальнай колькасьці браку, пр[...] У параўнаньні з ударным к[...] лам прастоі на фабрыцы вы[...] з 14 проц. да 17 проц.

Рацыяналізатарскія мерап[...] ствы на фабрыцы разгорнуты [...]

У бюро рацыяналізацыі мае ўдзел усяго толькі [...] комсамолец. Зусім слабы [...] комсамольцаў і ў працы вы[...] чых нарад. Бюро комсамол[...] колектыву не забясьпечыла [...] віцтва ўдарніцкім рухам. Нав[...] пыт работы двух комсамо[...] брыгад,—Бляцкага і Вальк[...] га,—якія толькі і перавыкон[...] прамфінплян, не распаўсюдж[...] на фабрыцы. З унесеных [...] манэўраў 179 прапаноў, з як[...] унесена комсамольцамі, ня[...] ажыцьцёўлены. Праверкай і [...] каваньня ні комсамольскі коле[...] ні іншыя організацыі фабры[...] займаліся. Таму невыпадкова, [...] прапановы яшчэ з 1929 го[...] якія выплачаны прэміі, адмі[...] цыяй ня выкананы.

Верасьнёўская адозва [...] УсеКП(б) сярод мас ко[...] мольцаў і беспартыйнай [...] дзі не распрацавана. Бюр[...] лектыву ЛКСМБ абгаварыла [...] толькі на сваім паседжаны[...] 16—IX-30 году, гэтым і аб[...] валася. **Бюро не знайшло н[...] патрэбным у сваёй паста[...] орыентаваць комсамольскія [...] сы на ўтварэньне ўда[...] брыгад імя 3-га году пяці[...] кі, на барацьбу з лятунст[...] за соцыялістычную сама[...] трактацыю.** А ў выніку—з [...] комсамольцаў, законтрактавалі[...] вытворчасьці толькі 45 чалаве[...]

Колектыў і цэхавыя яч[...] нічога не зрабілі для таго, [...] укараніць на фабрыцы вы[...] шыя формы соц. спаборні[...] і ўдарніцтва. Грамадзкі бу[...] плянава-опэрацыйныя групы [...] тальёны энтузіястых на [...] рыцы ня існуюць.

Сярод паасобных комсамол[...] асабліва ў ячэйцы канчатк[...] цэху, ёсьць настроі аб нема[...] масьці выканаць прамфінплян, [...] губленасьць перад цяжкасьцямі [...] такімі настроямі комсамольскі [...] лектыў не забясьпечыў патрэ[...] барацьбы.

Ня гледзячы на такія прар[...] райком комсамолу на праця[...] месяцаў не знайшоў патрэбным [...] няцца праверкай дзейнасьці ко[...] тыву ў барацьбе за прамфін[...] за ліквідацыю прарываў. Член [...] райкому,—сэкратар колектыву [...] рыкі тав. Варэйка,—аб гэ[...] таксама не паставіў пытаньня [...] райкоме.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" НЕ ЗМАГАЕЦЦА НА ДВА ФРОНТЫ

Ня варта даводзіць, якую вялікую ролю адыгрывае друк у барацьбе за прамфінплян. Але-ж калі мы возьмем шматтыражную газэту папяровай фабрыкі Чашніцкага раёну „Чырвоную Зорку", дык убачым, што газэта не спраўляецца з сваімі задачамі.

Газэта не орыентуе сваіх чытачоў на барацьбу на два фронты і сама дапушчае грубыя скрыўленьні партлініі.

Напрыклад, у першым нумары ад 19-га лістапада 1930 году зьмешчана передавая за подпісам рэдакцыі „Задачы нашай газэты". Рэдакцыя абмяжоўваецца заклікам да рабочых „прыняць удзел у выпуску газэты", „у высьвятленьні выкананьня прамфінфляну, колектывізацыі вёскі", а **галоўная задача—барацьба на два фронты—перадавою абейдзена.**

І такую лінію газэта працягвае з першага нумару. На 3-яй старонцы ў гэтым-жа нумары газэта зьмяшчае артыкул тав: **Блюмкіна**:—„Работу фабкому—пад абстрэл мас". Падводзячы вынікі „дзейнасьці" фабкому, тав. **Блюмкін** ставіць пытаньне:—„Чым-жа фактычна фабком займаўся?" і зараз-жа адказвае:—„Сута, панікёрства перад цяжкасьцямі, мягкацеласьць—вось работа фабкому". **Газэта не рашылася па-бальшавіцку заявіць аб права-опортуністычнай практыцы ў рабоце фабкому, які ня стаў на чале актыўнасьці рабочых мас у барацьбе з прарывамі.** Газэта назвала ўсё гэта проста „недахопам". Мо' дзеля таго, каб ня кінуліся ў вочы такія „мірныя" адносіны газэты да опортуністычных скажэньняў партлініі. У гэтым-жа нумары, над розным зборам матар'ялаў, газэта абмежавалася шапкай:—„Двурушнікаў—агентаў клясавага ворага—гнаць з партыі". „Хопіць лідэрам правага опортунізму граць у маўчанку".

Возьмем 3-ці нумар газэты-ад 17-га студзеня. Перадавая тав. Іваса: „Задачы на 3-ці рашаючы год пяцігодкі" **ня толькі ня выпячвае барацьбы на два фронты, як галоўную задачу выкананьня програмы 3-га рашаючага году пяцігодкі, але становіцца на непартыйныя позыцыі ў тлумачэньні прычын невыкананьня ва ўдарным квартале прамфінпляну.**

Вось што піша газэта:

„Ударны квартал скончыўся. Наступіў трэці год, рашаючы год пяцігодкі. Мы, дзякуючы недастатковай сваёй мобілізаванасьці, прапавалі ва ўдарным квартале нездавальняюча. Па ўсіх асноўных паказчыках мы вытворчую програму ня выканалі. Акрамя таго, маюцца моманты недысцыплінаванасьці і нядбайных адносін да працы, а таксама недастаткова чотка была пастаўлена організацыйная і тэхнічная праца па кіраўніцтву вытворчасьцю. Прагулы на сёньнешні дзень зусім яшчэ ня зьнішчаны. Мы маем за 20 дзён сьнежня 8 чалавека-дзён прагулаў без уважлівых прычын".

Чым-жа гэта тлумачыцца? А вось паслухайце:

„Усе гэтыя моманты сьведчаць аб тым, што няма ў нас дастатковай мобілізаванасьці, сьвядомасьці, што цяпер мы перажываем такі час, калі пры шпаркіх тэмпах па будаўніцтву соцыялізму маюцца цяжкасьці росту (падкрэсьлена намі-Жар), якія патрабуюць ад нас максыму напружанасьці ў працы, чоткай пастаноўкі дысцыплінаванасьці і ўвагі на вытворчасьці".

Бачыце, газэта тлумачыць прарыў „недастатковай сьвядомасьцю" і тым што „мы перажываем такі час, калі пры шпаркіх тэмпах будаўніцтва маюцца цяжкасьці росту". **Такім чынам, замест таго, каб весьці непрымірымую барацьбу з правым ухілам і прымірэнцтвам на фабрыцы, якія зьяўляюцца галоўным тормазам у мобілізацыі рабочых мас на ліквідацыю прарыву, газэта сама спасылаецца на об'ектыўныя прычыны.** Газэта ў гэтым нумары абмяжоўваецца таксама толькі шапкай:--„дадзім рашучы адпор опортуністычным адносінам да рабочых прапаноў". Вось у чым заключаецца „барацьба" газэты на два фронты.

Такія грубейшыя скажэньні партыйнай лініі ў газэце павінны атрымаць патрэбнае рэагаваньне з боку раённага камітэту партыі.

Жар

КІРАЎНІЦТВА АДДЗЕЛАМ КАДРАЎ ВСНГБ НЯ ЗДОЛЬНА ВЫКОНВАЦЬ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ

Опортуністычная практыка, бюрократычная цеганіна і міжведамственая грызьня прывялі да зрыву лютаўскага набору ў ФЗВ

УПАРТА ЗМАГАЦЦА І ДАМАГЧЫСЯ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ АБ ЗІМОВЫМ НАБОРЫ Ў ФЗВ 6 ТЫСЯЧ, НЯ МЕНШ!

„...Неабходна разгарнуць рашучую барацьбу з опортуністычнымі элемэнтамі, якія не разумеюць вялізарнейшага значэньня ФЗВ і іх ролі ў падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых кадраў і ставяць пытаньне аб скарочаньні ФЗВ.

Гэтыя спробы ёсьць скрытае праяўленьне барацьбы з ФЗВ, ёсьць спробы ігнараваньня рашэньняў 16-га зьезду партыі аб ФЗВ і замены ФЗВ кароткатэрміновымі формамі падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы з падлеткаў...“

(З рашэньняў ІХ зьезду ЎсеЛКСМ).

Прамая недаацэнка палітычнай важнасьці падрыхтоўкі кадраў праз асноўную форму—ФЗВ, опортуністычная практыка аддзелу кадраў ВСНГБ, накіраваная ўразрэз з рашэньнямі партыі, дала свае вынікі: лютаўскі набор у ФЗВ сарваны. Большасьць ФЗВ і будвучаў не падрыхтаваліся і аказаліся няздольнымі прыняць у свае шэрагі 6 тыс. падлеткаў.

Аддзел кадраў ВСНГБ сваёй опортуністычнай практыкай яшчэ раз паказаў сваю няздольнасьць праводзіць у жыцьцё рашэньні партыі, фактычна сарваўшы лютаўскі набор.

Ня гледзячы на шматлікія сыгналы друку і грамадзкіх організацый, да апошняга часу гаспадарчыя органы не атрымалі разьвёрсткі набору.

Ніжэй мы зьмяшчаем пастановы сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ па дакладу гаспадарчых організацый і матар'ялы з месц, якія з усёй яскравасьцю сьведчаць аб правільнасьці пастановы ЦК і яшчэ раз сьцьвярджаюць, што сыгналы „Чырвонай Зьмены“ аб пагрозе зрыву ігнараваліся ВСНГБ.

Органы ЦКК РСІ павінны прыняць самыя рашучыя захады да тых, хто ня здолен ажыцьцяўляць дырэктывы партыі.

Комсамольскія організацыі павінны накіраваць усе свае сілы на ліквідацыю прарыву з тым, каб навяротаць упушчанае за гэты час.

„...У асеньні набор мінулага году толькі па ФЗВ цэнзавай прамысловасьці было прынята 2588 чалавек, у зімовы набор павінна быць прынята 5100 чал., што ў агульнай колькасьці перавысіць кантрольныя лічбы пяцігадовага пляну.

Такім чынам, процант падрыхтоўкі рабочай сілы праз ФЗВ павялічыўся і выражаецца ў 10,2 проц. усіх рабочых, але ён яшчэ далёка не адпавядае той сучаснай устаноўцы, што ФЗВ зьяўляецца асноўнай формай падрыхтоўкі, не адпавядае патрабаваньням комсамолу аб тым, каб праз ФЗВ рыхтавалася ня менш 60 проц. рабочай сілы...“

(З дакладу тав. Палякова на Х зьезьдзе ЛКСМБ).

Пад шумок ведамственых перагавораў

Спачатку навучальнага году Слуцкая аб'яднаная профтэхшкола была перадана з мясцовага бюджэту на бюджэт ВСНГБ.

Аддзел кадраў ВСНГБ зусім ня цікавіўся становішчам школы. Каштарыс пяць месяцаў пераходзіў то на мясцовы, то на дзяржаўны бюджэт. А зараз ужо два месяцы, як зусім вісіць у паветры. Саюзтранс хацеў было ўзяць школу на свой бюджэт, але ВСНГБ на даў згоды. Школа ўжо два месяцы без усякіх сродкаў. Ні стыпэндый, ні зарплаты.

Для вырашэньня проблемы кадраў школа рашыла зрабіць датэрміновы выпуск трох курсаў. Вучні гэтых курсаў працавалі два месяцы без выхадных дзен, каб набыць лепшыя веды па такарнай справе.

Аддзел кадраў ВСНГБ даведаўся аб гэтым і адразу-ж абяцаў разьмеркаваць усіх вучняў па заводах, забясьпечыць кватэрамі і г. д.. Выпуск зрабілі, але вучні не разьмеркаваны. Пасьля доўгай валынкі школа была перадана Белсамсаюзу.

Вучні патрабуюць тармінова разьмеркаваць выпускнікоў па прадпрыемствах і скласьці для школы такія ўмовы, пры якіх яна сапраўды магла даць кваліфікаваныя кадры.

Ян Прыбытак

Цэхі апынуліся ў паветры

За лютаўскі набор Менскі Будвуч, пры Белдзяржбудаб'яднаньні, павінен быў набраць 50 асоб. З прычыны непадрыхтаванасьці памяшканьня гэтую лічбу скарацілі да 30. Зараз набор наогул адменены з-за непадрыхтаванасьці і адсутнасьці памяшканьня і інструментаў.

У чэрвені павінен адбыцца набор 140 чалавек, каб папоўніць існуючыя цэхі і аформіць новыя. Павінен быць адкрыты цясьлярна-апалубны цэх, а таксама каменна-атынкоўны. Але да гэтага часу ня высьветлена, што будзе адкрыта. Ні інструктароў, ні програм, ні об'ектаў для працы. Нават для старых цэхаў яшчэ канчаткова ня выпрацаваны програмы. Не падрыхтавана і памяшканьне.

Пры такой падрыхтоўцы ні гэты набор, ні далейшыя пасьпяхова ня пройдуць.

Самакрытыкоўскі

Абмежаваліся пастановамі

Бабруйскі ФЗВ мэталістых, пры машына-будаўнічым заводзе імя Сталіна, не падрыхтаваўся выканаць кантрольныя лічбы аб наборы 105 асоб.

Вынесены формальныя пастановы аб водпуску памяшканьня, але да гэтага часу нічога зроблена. Пры такім становішчы набор ня можа быць праведзены.

Бабруйскі РК ЛКСМ аб гэтым зусім не клапоціцца.

А. Фрайман,

Набор зрываецца

Ня гледзячы на своечасовыя сыгналы „Чырвонай Зьмены“ аб лютаўскім наборы у ФЗВ, ніхто ў Сьмілаўскім раёне на гэтую баявую работу не зьвяртае ўвагі.

Сумны вопыт зрыву набораў у мінулым нікім ня ўлічаны. Хто аб гэтым падумае?

Вясёлы С.

З пастановы сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ аб лютаўскім наборы у ФЗВ

Гаспадарчыя аб'яднаньні, як Белкоопсаюз, Галоўдартранс не праводзяць набору ў школы ФЗВ, што пагражае падрыхтоўцы кваліфікаванай рабсілы для гэтых галін народнай гаспадаркі і зьяўляецца простым невыкананьнем дырэктывы ЦК КП(б)Б аб зімовым наборы ў ФЗВ 6000 асоб. Неабходна правесьці зімовы набор у школы ФЗВ і Будвучы, якія падпарадкаваны вышэйназваным гаспадарчым аб'яднаньням, адтэрмінаваўшы яго на месяц.



Рыхтаваць кадры!

Вынік опортуністычнай практыкі

ЦК ЛКСМБ разглядае адносіны ВСНГБ да зімовага набору, які па сутнасьці сарваны, як шкодніцтва ў пытаньнях будаўніцтва фабзавучу.

Ня гледзячы на пастанову 3-яй сэсіі ЦВК СССР аб тым, каб скончыць набор да 1-га сакавіка і прыступіць да заняткаў, ВСНГБ яшчэ і да гэтага часу не разьмеркаваў кантр. лічбы прыёму ў школы ФЗВ па гаспадарчых аб'яднаньнях БССР.

Злачынная бязьдзейнасьць ВСНГБ і яго гаспадарчых аб'яднаньняў Белбудаб'яднаньня, Белмэтальаб'яднаньня і інш. (у пытаньнях капітальнага будаўніцтва ФЗВ) прывяла да таго, што нават мінімальную лічбу, 2500 асоб, існуючыя фабзавучы ў зімовы набор змогуць прыняць з вялікай цяжкасьцю.

Міжведамственая грызьня паміж ВСНГБ і Наркампрацы аб тым, хто павінен організоўваць курсы па падрыхтоўцы падлеткаў у ФЗВ, прывяла да таго, што зьніжэньне агульна-адукацыйнай базы за апошні час ператвараецца ў сыстэму і стварае пагрозу парушыць асноўныя прынцыпы ФЗВ.

Ня выконваюць дырэктывы партыі

ВСНГБ яшчэ да гэтага часу ня даў ліміты капітальнага будаўніцтва ФЗВ гаспадарчым аб'яднаньням, што ня толькі зрывае зімовы набор і ставіць пад пагрозу зрыву капітальнае будаўніцтва фабзавучаў у 1931 годзе, але ідзе ў разрэз з пастановамі партыйных зьездаў аб пашырэньні сеткі школ ФЗВ.

ВСНГБ не разгарнуў падрыхтоўку да капітальнага будаўніцтва, не кіраваў і не праверыў дзейнасьці гаспадарчых організацый у гэтым напрамку. Прасіць ЦКК РСІ заняцца праверкай здольнасьці ВСНГБ правесьці капітальнае будаўніцтва і прыняць неабходныя, рашаючыя захады. Комсамольскім ячэйкам ВСНГБ і гаспадарчых аб'яднаньняў сачыць і прасоўваць справу капітальнага будаўніцтва ФЗВ. ЦК катэгорычна выказваецца за максымальнае павялічэньне кантрольных лічбаў зімовага набору ў фабзавучы ВСНГБ, а таксама за поўнае выкананьне лічбы ў 6000 асоб па ўсіх ФЗВ БССР, згодна пастановы ЦК КП(б)Б ад 8-VIII-30 г.

Улічваючы асаблівую патрэбнасьць у кадрах дэфіцытных кваліфікацый (такары, модэльшчыкі, фрэзэроўшчыкі, фармоўшчыкі і інш.), ня менш 60 проц. прынятых падлеткаў у ФЗВ у зімовы набор разьмеркаваць па аддзелах, якія рыхтуюць рабочых дэфіцытных кваліфікацый.

Патрэбна баявая праверка

ЦК ЛКСМБ адзначае, што такое становішча з зімовым наборам у школы ФЗВ магло здарыцца ў выніку права-опортуністычнай практыкі аддзелаў кадраў і ў першую чаргу аддзелу кадраў ВСНГБ.

Прасіць ЦКК РСІ перагледзець склад працаўнікоў аддзелу кадраў з мэтаю зьняць з працы шкодных элемэнтаў, якія зрываюць справу падрыхтоўкі кадраў кваліфікаванае рабсілы. Лічыць неабходным уключыцца ў абсьледаваньне становішча і падрыхтоўкі кадраў для прамысловасьці БССР, якое праводзіцца НК РСІ.

Выходзячы з гэтага: Усім РК і ячэйкам зараз-жа разгарнуць шырокую працу па організацыі зімовага набору ў ФЗВ. Распрацаваць на сходах рабочых кантрольныя лічбы зімовага набору. У месячны тэрмін са дня апублікаваньня данай пастановы правесьці зімовы набор, падрыхтаваўшы адпаведныя ўмовы для вучобы.

Комсамольскім колектывам прадпрыемства ўзяць на буксір правядзеньне капітальнага будаўніцтва. Ячэйкам КСМ гаспадарчых аб'яднаньняў сачыць за своечасовым выкананьнем чарцяжоў, разьмеркаваньнем матар'ялаў і сродкаў з тым, каб у бліжэйшы час бальшавіцкімі тэмпамі забясьпечыць скончаньне капітальнага будаўніцтва.

Прасіць СНК БССР даць жорсткія ўказаньні ВСНГБ і гаспадарчым аб'яднаньням аб тэрміновым разгортваньні капітальнага будаўніцтва.

Ніхто не рыхтаваўся

Будвуч БЖС, зьліўся з профэсыйна-тэхнічнай школай будаўнікоў. Не абышлося гэта без значных перашкод на ўсёй рабоце. За апошні час становішча школы значна пагоршылася.

Сьлесарны цэх працуе з вялікімі перабоямі і прастоямі, бо дрэнна забясьпечаны матэр'яламі.

Калі пачаліся маразы—стала зусім цяжка. Вучні стаялі за варштатамі ў паліто і рукавіцах, а часам увесь цэх грэўся каля печы.

Ня лепш пастаўлена і акадэмічная вучоба. Вельмі часта па віне настаўнікаў зрываюцца лекцыі.

Лютаўскі набор сарваны, бо школа да яго зусім не рыхтавалася. І пасьля адтэрмінаваньня яго таксама не рыхтуецца. Няма памяшканьня для працы, у клясах холадна. Будвуч не забясьпечаны неабходнымі для вучобы ўмовамі.

Абсьледваньне, якое праводзяць грамадзкія організацыі і комсамол, павінна зрабіць карэнны пералом у становішчы будвучу.

А. Лёў

Палепшыць харчаваньне

Сталоўка № 50 абслугоўвае 100 чалавек студэнтаў хэміка-тэхнолёгічнага тэхнікуму, ФЗВ КІМ'у, індустрыяльна-пэдагогічнага інстытуту. Будынак сталоўкі ў такім стане, што кожную хвіліну можа здарыцца пажар. З даху цячэ ў талеркі.

А побач з сталоўкай—інтэрнат ФЗВ КІМ'у. Брудны антысанітарны. Аддзел грамадзкага харчаваньня МЦРК, у асобе загадчыка Бэсэзона, ведае аб гэтым, але ня думае рамантаваць сталоўку.

Фабзавучнікі і студэнты патрабуюць забясьпечыць іх сталоўкай і інтэрнатам, здавальняючымі ў санітарных адносінах.

Брыгадзіры „Ч. З.“—А. Ц. і Я. П.

Пагроза зрыву яшчэ не адведзена

Мінула ўжо два тыдні, як ЦКК РСІ Беларусі абвясьціў двухдэкаднік ліквідацыі прарываў у ільназагатоўках. Але тэмпы загатовак як першай, так і другой пяцідзёнкі першай дэкады штурму ні ў якім разе не забясьпечваюць выкананьне задач, пастаўленых партыяй і ўрадам перад двухдэкаднікам.

Тэмпы нарастаньня з пяцідзёнкі ў пяцідзёнку абсолютна нездавальняючыя.

Так, напрыклад, з 5 па 10 лютага гадовы плян па ільнавалакну быў выканан на 28,4 проц., а на 16 лютага—толькі на 29,7 проц.

Колгасны сэктар, які паказаў лепшыя ўзоры выкананьня намечаных плянаў хлебазагатовак у ільназагатоўках ганебна цягнецца ў хвасьце, даўшы толькі 21,7 проц. пляну.

Трэба як найхутчэй кінуць комсамольскія ўдарныя брыгады на дапамогу колгасам у апрацоўны лёну, трэба нарэшце пакончыць з опортуністычнай стаўкай на самацёк, трэба прымусіць кулацка-заможныя гаспадаркі выканаць цьвёрдыя заданьні па здачы лёну дзяржаве.

ЛЁН ЯШЧЭ НЯ УЗЯТЫ

РАСОНЫ (па тэлеграфу)—Расонскі РК КП(б)Б не пераключыўся на правядзеньне 2-хдэкадніку штурму прарываў у ільназагатоўках. За апошнюю пяцідзёнку загатоўлена менш чым у мінулыя. Парторганізацыя у штурме ня ўдзельнічае. Райкомам партыі гэта пытаньне яшчэ не разьбіралася.

Маецца шэраг фактаў, калі колгасы займаюцца самазабясьпечаньнем. Райвыканком ня прымае ніякіх захадаў да сельсаветаў, якія не разгарнулі работу на ільназагатоўках.

Па лініі РК ЛКСМБ на правядзеньне 2-хдэкадніку мобілізавана 45 камсамольцаў, з якіх 30—на дапамогу колгасам у апрацоўцы лёну.

Львовіч

Рабочыя брыгады выехалі ў раёны

МАГІЛЁЎ (Ад нашага спэцкора)—13-га лютага Магілеўскі апорны пункт ЦКК КП(б)Б. ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ скончыў усю організацыйна-падрыхтоўчую работу па правядзеньню двухдэкадніку штурму прарыву ў ільназагатоўках. У 18 раёнаў выехалі брыгады ў кольказьці 48 чал., з іх-18 партыйцаў, 15 комсамольцаў і 15 рабочых-ударнікаў.

С

Толькі 15 процантаў

РАГАЧОЎ, 18.—(Па тэлефону ад нашага спэцкора).—У сувязі з абвяшчэньнем двухдэкадніку штурму прарываў на фронце ільназагатовак гарадзкі актыў і ўсе адказныя працаўнікі РК КП(б)Б, РК ЛКСМБ і РВК гораду Рагачэва накіраваны ў раён.

У выніку выездаў у ільназагатоўках наглядаецца некаторы, але далёка нездавальняючы, пералом.

Так, калі заданьне па загатоўцы ільна-валакна на 5 лютага было выканана ўсяго на 4,6 проц, дык зараз яно выканана на 15 процантаў.

В. С.

Лёзунгі політкіраўніцтва РСЧА да XIII гадавіны Чырвонай арміі

1. Ні аднэй пядзі чужой зямлі ня хочам, але і сваёй зямлі ні аднаго вяршка не аддамо. (Сталін).
2. Няхай жыве XIII гадаціна Чырвонай арміі. Бальшавіцкае прывітаньне чырвонаармейцам, камандзірам і політработнікам.
3. Няхай жыве УсеКП(б)—правадыр і організатар Чырвонай арміі! Цясьней рады вакол генэральнай лініі партыі, вакол ленінскага ЦК на чале з тав. Сталіным!
4. Комуністыя Чырвонай арміі—надзейны, загартаваны ленінскі атрад партыі! Вышэй сьцяг Леніна—сьцяг УсеКП(б)! Супроць правых і „левых“ ухілістых, прымірэнцаў і двурушнікаў—агентаў клясавага ворага!
5. За высокія, напружаныя тэмпы баявой падрыхтоўкі, за выкананьне вучэбна-баявых задач, якія пастаўлены перад арміяй Рэввоенсаветам Саюзу на 1931 год!
6. Тэхніка ў пэрыод рэконструкцыі вырашае ўсё (Сталін). Камандзіры, політработнікі і чырвонаармейцы—навучэцеся дасканала ўладаць тэхнічнымі сродкамі барацьбы!
7. Камандзіры і політработнікі, аўладайце мастацтвам кіраўніцтва войскамі, аснашчанымі сучаснай ваеннай тэхнікай!
8. За ўважлівыя, ашчадныя адносіны да становішча сваёй зброі. За 100 проц. заўсёды безадмоўны бой вінтоўкі і кулямёта! За безадмоўную меткую страляніну артылерыі!
9. Вышэй бальшавіцкія тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва—Чырвоная армія на варце Савецкага Саюзу, што ўступіў у пэрыод соцыялізму!
10. Выканаць пяцігодку за чатыры гады, а па асноўных, рашаючых галінах прамысловасьці—за тры гады і завяршыць пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі—непахісную базу абароназдольнасьці краіны!
11. Рабочыя, чыгуначнікі, воднікі, узмацняйце транспорт, умацоўвайце абарону!
12. За суцэльную колектывізацыю, за ліквідацыю кулака як клясы! Чырвонаармеец—селянін-аднаасобнік, уступай у колгас!
13. Профсаюзы, фабрыкі і заводы—узмацняйце рабочае шэфства над Чырвонай арміяй!
14. Няхай жыве ленінскі комсамол—шэф морскага і паветранага флёту! Комсамольцы—на самалёт, на танк, на баявыя судны!
15. Лепшых комуністых, комсамольцаў, маладых пролетараў—у вайсковыя школы, у рады камандзіраў РСЧА!
16. Працоўны, узмацняй Асоавіяхэм! Вывучай вайсковую справу! Мацуй абарону СССР!
17. Прывітаньне перадавому атраду соцыялістычнага спаборніцтва РСЧА—байцам-ударнікам!
18. Чырвонаму морскаму флёту—пільнаму вартаўніку савецкіх берагоў—наша баявое прывітаньне!
19. Прывітаньне паветранаму флёту—гэроічнаму абаронцы савецкіх межаў!
20. Стойкім і пільным вартавым неабсяжных межаў СССР—чырвоным пагранічнікам—пролетарскае прывітаньне!
21. Чырвонаармейцы і начальніцкі склад РСЧА! Тэмпы вырашаюць! За напружаныя ўдарныя тэмпы баявой падрыхтоўкі!

Політычнае кіраўніцтва РСЧА

Вечар сустрэчы комсамола з настаўніцтвам

17 лютага ў перапоўненай залі клюбу Мэталістых адбыўся вечар сустрэчы комсамольскай організацыі з прадстаўнікамі усебеларускага настаўніцкага зьезду.

На вечары прадстаўнік колектыву ЛКСМБ заводу „Бальшавік“ тав. Ліньчук рапартаваў:

— „Мы ў сваёй штодзённай рабоце дабіліся ліквідацыі няпісьменнасьці 85 чал. Разам з намі працуюць вучні 5 школы, мы змагаемся за політэхнічную школу“.

Прадстаўнік колектыву ЛКСМБ „Энэргії“ рапартаваў:

— „Калі ў пачатку 1930 году на нашым заводзе было 400 рабочых, дык зараз іх маецца 1230 чалавек, з іх 970 ударнікаў, якія закантрактавалі сябе да канца пяцігодкі. Шляхам організацыі лікпунктаў мы навучылі грамаце 110 малапісьменных і 23 няпісьменных рабочых. У сьценах нашага заводу політэхнізуецца 20 школа“.

Прадстаўнік асьветнікаў Сіроцінскага раёну сказаў:

— „Колектыў асьветнікаў Сіроцінщчыны на 100 проц. замацаваў сябе да канца пяцігодкі і абвясьціў сябе ударным 3 рашаючага году 5-годкі“.

Прадстаўнік уральскай дэлегацыі ад імя 30-тысячнай арміі асьветнікаў Уралу і комсамольскай організацыі, заклікаў комсамол Беларусі мобілізаваць лепшых комсамольцаў на працу у другі мэталюргічны (Кузьнечны) басэйн, які адыгрывае вялікую ролю ў выкананьні пяцігодкі у чатыры гады.

Наркамасьветы БССР тав. Платун зазначыў, што комсамол культэстафэту не давёў да канца. „Наш сёньняшні вечар“—адзначае тав. Платун,—павінен паслужыць пачаткамі цеснай сувязі асьветнікаў з комсамолам. У гэтым годзе комсамол Беларусі павінен мобілізаваць у пэдагогічныя установы—500 чалавек“.

Пасяджэньне бюро ЦК ЛКСМБ

сумесна з часьцямі паветранага флёту і гарадзкім комсамольскім актывам, прысьвечанае прыняцьцю шэфства над паветраным флётам,

АДБУДЗЕЦЦА 22 ЛЮТАГА.

Памыляецеся, бюргер „К“!

Нейкі нямецкі мешчанін, пад скромным подпісам „К“ друкуе ў газэце „Бэрлінэр Тагеблят“ сэрыю артыкулаў, якія малююць становішча Савецкага Саюзу. Праўду кажучы, мы абышлі-б моўчкі „тэорэтычныя працы“ славутага „К“, калі-б ён не закрануў пытаньня аб рабочай моладзі ў СССР.

У сваім артыкуле бюргер „К“ імкнуўся „давесьці“, што „асабістыя і культурныя сувязі Савецкага Саюзу з Захадам „адміраюць“ і „падрастаючае пакаленьне ня мае магчымасьці ні ведаць, ні ўявіць сабе, што магчымы іншыя ўмовы жыцьця, чым тыя, якія існуюць у Савэцкім Саюзе“.

Нажаль, бюргер „К“, вы глыбока памыліліся. Мы добра ведаем, як жывуць, працуюць і змагаюцца працоўныя ўсяго сьвету. Нам вядома, што: „У 31 краіне капіталу, у студзені гэтага году, было 33 мільёны 115 тысяч беспрацоўных, не лічачы паўбеспрацоўных. якія маюць працу 2-3 дні ў тыдзень (да рэчы кажучы, у нас беспрацоўе ліквідавана. Ц. В.). У Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатах у студзені налічвалася 10 мільёнаў беспрацоўных, у Нямеччыне—5 мільёнаў, Латынскай Амэрыцы 4 мільёны, Англіі—3 з паловай мільёны, Японіі—2 мільёны, Італіі каля 2-х мільёнаў і ў Польшчы— 1 мільён.

Нават у самых дробных эўропэйскіх краінах, з насельніцтвам у некалькі мільёнаў чалавек, беспрацоўе налічваецца сотнямі тысяч. Так, у Баўгарыі мелася 200 тысяч беспрацоўных, у Грэцыі—150 тысяч, у Голяндыі—150 тысяч, у Бэльгіі—120 тысяч і ў Фінляндыі 100 тысяч.

У Чэха-Славакіі (у Дуксе і іншых гарадох) расстрэльваюць беспрацоўных дэмонстрантаў.

У паўднёвай частцы Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, якія летась былі ахоплены засухай, значная частка сельска-гаспадарчага насельніцтва галадае.

У паўднёвых штатах штодзённа памірае ад голаду тысячы чалавек. Галеча дасягнула такіх памераў, што шмат якія сям'і за бясцэнак прадаюць свае пасьцелі і печкі. Людзі сьпяць на падлозе, па сотні чалавек упокат. Некаторыя сем'і жывуць як дзікія зьвяры, сьпяць на лісьцях і харчуюцца толькі карэньнямі.

Акрамя гэтага, вы, бюргер „К“, у сваім першым артыкуле гаворыце, што працоўная моладзь СССР толькі спачувае савецкаму ладу. І тут вы памыляецеся! І тут вы не папалі ў цэль!

Працоўная моладзь ня толькі спачувае, але і самаахвярна змагаецца пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і комсамолу за перамогу соцыялізму ў нашай краіне.

Ц. В.

Поліцыя скалачвае новы процэс уяўных беларускіх тэрарыстых

ВАРШАВА, 17.—Увесь друк стрыкаціць новымі паведамленьнямі аб масавых арыштах па ўсёй краіне. Арышты праводзяцца ў сувязі з падрыхтоўкай дня беспрацоўя і ліквідацыі левай ППС.

Друк паведамляе, што поліцыя арыштавала ў Варшаве кіраўнікоў вясковага аддзелу ЦК КПП. У Лодзі і ў Станіслававе апячатаны памяшканьні таварыства эспэрантыстых, якіх падазрэюць у комуністычнай дзейнасьці, прычым, у Станіслававе арыштавана 30 чал.

Мяркуючы па паведамленьнях газэт, поліцыя робіць усё, каб скалаціць новы вялікі процэс уяўных беларускіх тэрорыстых, прычым арышты ўсяляк зьвязваюцца з імем нядаўна арыштаванага Тарашкевіча.

Поліцыя з голымі шаблямі атакавала дэмонстрацыю моладзі

ПАРЫЖ, 17.—Па паведамленьню агенцтва Гавас, у Мадрыдзе (Гішпанія) аб'яўлена ўсеагульная забастоўка. Адбылася дэмонстрацыя моладзі. Дэмонстранты наладзілі шэсьця ў цэнтр гораду з выкрыкамі:—„сьмерць каралю, няхай жыве рэспубліка“. Поліцыя пакінулася на дэмонстрантаў з голымі шаблямі. Некалькі чалавек арыштавана.

Улада прымае надзвычайныя меры ў сувязі з аб'яўленай забастоўкай. Зноў уведзена цэнзура. Магчыма, што будзе ўведзены ваенны стан.

Адказны рэдактар—МІХ. ПЛАТАЎ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599